Источник: "Краязнаўчая газета" - 2019-06-20

# Вынішчалі. Спахапіліся. Клопат аб супергрызунах




Выратавальная каманда грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і яе партнёраў – Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах, Гарадоцкага лясгаса і грамадскага аб'яднання «Неруш» – абвясціла аб пачатку аперацыі «Хамяк, суслік і палятуха: выратаваць супергрызуноў!». Гэта назва экалагічнай ініцыятывы – адной з пераможцаў конкурсу экалагічных ініцыятываў праекта «Экаманіторынг», што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Міністэрствам прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

Чаму ініцыятыўная група вырашыла ратаваць менавіта грызуноў? Калісьці два з трох звяркоў былі прызнаныя шкоднікамі сельскай гаспадаркі, а цяпер усе яны трапілі ў Чырвоную кнігу Беларусі, а суслік апынуўся нават у міжнароднай Чырвонай кнізе, як, напрыклад, зубр і вяртлявая чаротаўка. Магчымая страта гэтых звяркоў скароціць біяразнастайнасць і збядніць жывёльны свет Беларусі, парушыць трафічныя ланцужкі ў экасістэмах, таму ў рамках праекта «Экаманіторынг» падтрымліваюцца такія ініцыятывы.

Сёння няма дакладных дадзеных аб колькасці гэтых грызуноў у Беларусі. Некалькі гадоў таму адмысловыя пошукі хамяка скончыліся нічым. Пасля абвяшчэння ініцыятывы АПБ атрымала паведамленне пра сустрэчу з хамяком, першае вядомае вучоным за апошнія 10 гадоў. У 1980-х у нас было вядома 89 калоніяў рабога сусліка. Некалькі гадоў таму апошнія вядомыя калоніі былі выпадкова знішчаныя. Пасля абвяшчэння ініцыятывы праекта АПБ ужо атрымала першыя звесткі пра новыя калоніі. У межах праекта яны будуць правераныя і атрымаюць ахоўны статус, а таксама АПБ паспрабуе знайсці іншыя калоніі, што захаваліся.

З 1996 г. ніхто не бачыў у Беларусі палятуху, пакуль у 2017 г. актывісты АПБ Дзяніс Кіцель і Андрэй Абрамчук не знайшлі некалькі тэрыторыяў на поўначы Беларусі. Але на сёння невядомае дакладнае распаўсюджанне гэтага віду, і ініцыятыва праекта дазволіць знайсці па максімуме ўсе тэрыторыі гэтых звяркоў, а таксама вывучыць і зняць магчымыя пагрозы.

Шукаць супергрызуноў будуць у 19-і раёнах Беларусі. Адмысловая праца запланаваная з людзьмі – суседзямі рэдкіх відаў. Адна з асноўных мэтаў праекта «Экаманіторынг» – далучэнне грамадскасці да экалагічнай актыўнасці, прынясце экалагічных рашэнняў Галоўны фактар знікнення хамяка, сусліка і палятухі, як і многіх іншых відаў, – антрапагенны. Звяры знікаюць пасля ўзворвання ўскрайкаў палёў і выганаў, зарастання пашы праз невыкарыстанне і ад іншых фактараў. Эксперты ініцыятывы правядуць адмысловыя сустрэчы з настаўнікамі, школьнікамі, леснікамі і мясцовымі жыхарамі, каб расказаць пра тое, як яны могуць дапамагчы выратаваць віды.

І, нарэшце, чаму хамяк, суслік і палятуха – супергрызуны? Адказвае дырэктар АПБ Аляксандр Вінчэўскі: «Усе гэтыя грызуны маюць суперздольнасці! Палятуха ўначы лётае ў лесе, да 50-і метраў. У яе ёсць у шкілеце пярэдніх лапаў спецыяльная костка, якая дазваляе шырэй расцягваць перапонкі, каб планіраваць. У хамяка ёсць зашчочныя мяшкі, якія працягваюцца да плячэй. У іх ён можа насіць корм на адлегласць да кіламетра і здольны назапасіць у нары да 10-і кг насення. А для вынішчэння рабога сусліка ў савецкі час быў створаны адмысловы самалёт! Але наш герой выжыў, хоць і з вялізнымі стратамі. Сённяшні свет такі, што і супергероі могуць мець патрэбу ў дапамозе. Нашая арганізацыя займаецца не толькі птушкамі, але ў цэлым захаваннем біяразнастайнасці. Дзякуючы праекту мы зможам закупіць спецыяльнае абсталяванне, якога пакуль няма ў акадэмічных навукоўцаў-заолагаў, частку абсталявання мы потым перадамо ім».

Спецыялісты ў рамках ініцыятывы праекта падрыхтуюць адмысловыя Планы дзеянняў па захаванні хамяка, сусліка і палятухі. Інфармацыя пра распаўсюджанне і пагрозы будзе сабраная за 18 месяцаў праекта. У межах ініцыятывы на кожнае месцапражыванне гэтых відаў будуць падрыхтаваныя пашпарты і ахоўныя паперы.


© Денис Китель





***Паводле паведамлення прэс-офіса ПРААН у Беларусі***

"Краязнаўчая газета". Вынішчалі. Спахапіліся. Клопат аб супергрызунах